УДК 947.6“1921/1939”–053.81

**В. В. ДАНІЛОВІЧ**

# УДЗЕЛ МОЛАДЗІ Ў ПРАФСАЮЗНЫМ РУХУ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 гг.)

*Артыкул прысвечаны даследаванню праблемы ўдзелу моладзі ў прафсаюзным руху Савецкай Беларусі 1920–30-х гг. Сцвярджаецца, што ў 1920-я гг. адным з важнейшых напрамкаў дзейнасці камсамола лічылася прадстаўніцтва ў прафсаюзах. Камсамол выкарыстоўваў іх як пляцоўку для пашырэння уплывў на юнакоў і дзяўчат. Праца камсамола з маладымі членамі прафсаюзаў мела шырокі спектр напрамкаў і карысталася падтрымкай прафсаюзнага кіраўніцтва. Паступова, хоць і нераўнамерна, расла колькасць моладзі сярод членаў і актывістаў прафсаюзаў, што сведчыць аб імкненні юнакоў і дзяўчат да адстойвання сваіх эканамічных інтарэсаў. Пры гэтым камсамольцамі былі меньш паловы маладых членаў прафсаюзаў. У 1930-я гг., нягледзячы на ўсё больш узрастаючую актыўнасць моладзі ў сацыялістычным будаўніцтве і прафсаюзнай працы, зусім малой заставалася камсамольская праслойка ў прафсаюзным апараце, прафсаюзы слаба займаліся абаронай інтарэсаў моладзі. Такое становішча тлумачыцца тым, што на прафсаюзным жыцці адбілася барацьба з апазіцыяй ўнутры кампартыі. Толькі напрыканцы 1930-х гг. грамадская актыўнасць прафсаюзаў зноў пачала расці.*

*The article investigates the problem of youth participation in the trade union movement of Soviet Belarus in the 1920s and 1930s. In the 1920s one of the most important activities of the Young Communist League is considered the representation in trade unions. The Young Communist League used them as a platform to expand its influence among boys and girls. Its work with young union members had a wide range of areas and enjoyed the support of the union leadership. The number of young people among the members and union activists was gradually growing, demonstrating the willingness of young people to advance their economic interests. At the same time there were less members of the Young Communist League than half of young trade unionists. In the 1930s in spite of the ever-increasing activity of young people in socialist construction and in trade union work, a very small layer of the Young Communist League was in the trade union apparatus. Trade unions were poorly engaged in protection of interests of boys and girls. This situation is explained by the fact that the trade union life reflected the struggle with the opposition within the Communist Party. Only in the late 1930s social activity of trade unions started to grow again.*

Як вядома, найбуйнейшымі грамадскімі арганізацыямі савецкага часу былі прафсаюзы. Зразумела, што ні моладзь, ні камсамол не маглі заставацца ў баку ад прафсаюзнай дзейнасці.

Так, у чэрвені 1921 г. Камуністычны саюз молодзі Беларусі (КСМБ) актывізаваў працу сярод маладых членаў прафсаюза транспартнікаў ССРБ праз спецыяльных участковых інструктараў [1, л. 3].

Да канца мая 1922 г. камсамольцы ССРБ правялі буйную кампанію па прыцягненні ўвагі прафсаюзных органаў да рабочых юнакоў і дзяўчын, з якімі ў далейшым саюз ажыццяўляў сувязь менавіта праз прафсаюзы [2, л. 13; 3, л. 7].

Пасля IV з’езда КСМБ, з лета 1922 г., асаблівая ўвага была звернута на працу ўнутры прафсаюзнага руху (да гэтага часу сістэматычнай камсамольскай работы там не вялося). Па Мінску і паветах былі выдзелены камсамольскія прадстаўнікі ў праўленні прафсаюзаў. У выніку разгорнутай працы прафсаюзамі ССРБ былі прынятыя вылучаныя камсамольцамі дадатковыя пункты ў калектыўныя працоўныя дагаворы аб аплаце і ахове працы моладзі [4, л. 8]. Гэта сведчыць аб узмацненні ўвагі камсамола ССРБ да пазасаюзнай эканамічнай работы, што можна патлумачыць жаданнем пашырыць свой уплыў на маладых людзей рэспублікі з дапамогай вырашэння іх надзённых эканамічных праблем. Зразумела, што для такой мэты найлепшым сродкам з’яўляліся прафсаюзы.

Асноўная ўвага надавалася працы ў тых прафсаюзных арганізацыях, дзе была сканцэнтравана найбольшая колькасць рабочай моладзі (прафсаюзы гарбароў, швейпрама, харчавікоў, металістаў). У іх прадстаўнікі КСМБ хоць і несістэматычна, але імкнуліся праводзіць сходы маладых членаў прафсаюзаў, на якіх абмяркоўваліся як эканамічныя, так і прапагандысцкія пытанні (значыць, камсамольцы выкарыстоўвалі эканамічную працу і ў прапагандысцкіх, палітычных мэтах). Так, у прафсаюзе гарбароў было арганізавана пяць сходаў, у прафсаюзе швейпрама — два, у прафсаюзе харчавікоў — чатыры, у прафсаюзе металістаў — тры. Аднак такія сходы не ахапілі яшчэ ўсіх працуючых юнакоў і дзяўчын. Не ва ўсіх прафсаюзах дзейнасць камсамола была паспяховай. Так, слаба вялася праца ў прафсаюзе хімікаў, прадпрыемствы якога былі раскіданы па паветах і перажывалі буйны крызіс. Найлепш праца камсамола савецкай Беларусі ў прафсаюзах была пастаўлена ў Слуцку і Барысаве, горш — у Мазыры і Бабруйску. Трэба адзначыць, што ў Слуцку і Бабруйску камсамольская прафсаюзная праца тармазілася ў сувязі з тым, што большасць тамтэйшых рабочых юнакоў і дзяўчын — былыя камсамольцы і камсамолкі, якія прадузята ставіліся да працы саюза [4, л. 8]. Гэта сведчыць аб тым, што аўтарытэт арганізацыі сярод моладзі у свой час быў моцна падарваны і яшчэ не ўсюды аднавіўся.

Увогуле дзейнасць КСМБ у прафсаюзах ССРБ на дадзеным этапе можна ахарактарызаваць як работу па

наладжванні сувязяў і заваяванні аўтарытэта сярод рабочай моладзі.

Прадстаўніцтва ў праўленнях прафсаюзаў лічылася важнейшай працай камсамола. З прадстаўнікоў КСМБ у прафсаюзах па Мінску і большасці паветаў быў арганізаваны гурток, які вывучаў гісторыю і тактыку прафсаюзнага руху і практычна кіраваў працай камсамольскіх прадстаўнікоў у праўленнях прафсаюзаў рэспублікі. Аднак прадстаўнікі саюза да кастрычніка 1922 г. нармальна працавалі толькі ў прафсаюзах гарбароў, швейнікаў, металістаў і харчавікоў. У астатніх прафсаюзах камсамольскіх прадстаўнікоў не было, ці яны не праяўлялі актыўнасці. Разам з тым V з'езд камсамола ССРБ адзначаў паляпшэнне сувязі і рост аўтарытэта саюза ў прафсаюзах і сярод рабочай моладзі [2, л. 14; 5, л. 15; 6, л. 87, 124].

У 1923 г. вялікая колькасць прадстаўнікоў РКСМ ва ўсходняй Беларусі была ўключана ў склад праформаганаў, але яны ў выніку адрываліся ад саюзнай дзейнасці [7, л. 2], што абмяжоўвала ініцыятыву пашырэння іх колькасці з боку камсамола. Акрамя таго, у сувязі з пераносам кіруючага цэнтра эканамічна-праватвой працы ў прафсаюзы камсамольцы часта не інфармаваліся аб ёй [8, л. 134; 9, л. 62], што гаворыць аб дрэнным узаемадзеянні камсамола і прафсаюзаў.

Нягледзячы на гэта, колькасць моладзі і падлеткаў сярод членаў і актывістаў прафсаюзаў Беларусі паступова расла. Маладое пакаленне актыўна ўдзельнічала ў правядзенні перавыбараў нізавых прафячэяк. Аднак у некаторых прафсаюзных арганізацыях на сходах не ставіліся пытанні працы з юнакамі і дзяўчынамі. Сярод маладых членаў прафсаюзнага кіраўніцтва назіралася цякучка, бо яны былі празмерна загружаныя. Слаба была ахоплена прафсаюзамі моладзь у дробна-саматужнай прамысловасці. Некаторыя прафсаюзы аддавалі прыярытэт пры прыёме на працу дзецям рабочых адпаведнага прадпрыемства [10, л. 215–216]. У цэлым можна зрабіць выснову, што сярод маладых людзей існавала зацікаўленасць у працы прафсаюзаў, аднак няўлік асобнымі прафсаюзамі інтарэсаў юнакоў і дзяўчын, празмерная загружанасць маладых працаўнікоў прафсаюзных органаў і наяўнасць пэўнага пратэкцыянізму ў некаторых прафсаюзах перашкаджалі росту актыўнасці моладзі ў прафсаюзным руху.

Палітасветработа КСМБ сярод беспартыйнай рабочай моладзі прафсаюзаў выяўлялася ва ўцягванні яе ў агульнаадукацыйныя школы для моладзі, спартыўныя групы, камсамольскія экскурсіі, вечарыны і клубы, арганізацыі ячэяк камсамола па вытворчаму прынцыпу. У Мінску і Бабруйску былі створаны прафесійныя клубы для рабочай моладзі. Гэта праца вялася з максімальным выкарыстаннем сіл і сродкаў прафсаюзных органаў. Прафсаюзныя камісіі па культуры адлічвалі пэўны працэнт са сваіх бюджэтаў на працу камсамольцаў сярод моладзі прафсаюзаў [11, л. 12–13]. Як бачым, праца саюза з маладымі членамі прафсаюзаў з аднаго боку мела даволі шырокі спектр напрамкаў, што сведчыць аб імкненні максімальна ўлічваць інтарэсы юнакоў і дзяўчын, а з другога карысталася падтрымкай, у тым ліку матэрыяльнай, прафсаюзнага кіраўніцтва (такія прыязныя адносіны можна растлумачыць падтрымкай дзейнасці камсамола на дзяржаўным узроўні).

КСМБ дзейсна ўдзельнічаў у працы з'ездаў прафсаюзаў, праводзячы сваіх прадстаўнікоў у члены і кандыдаты прафсаюзных праўленняў. На двух з'ездах прафсаюзаў ССРБ з 487 дэлегатаў 66 (14 %) былі камсамольцамі. У 13 з 14 прафсаюзных праўленняў рэспублікі былі выбраны прадстаўнікі КСМБ. Тое ж назіралася і ў складзе павятовых праўленняў прафсаюзаў, акрамя Барысава. На май 1923 г. камсамол ССРБ меў 17 працаздольных прадстаўнікоў у губернскіх прафсаюзных аддзелах, два — у павятовых прафбюро, 17 — у павятовых прафаддзяленнях. Гэтыя прадстаўнікі вялі сістэматычную планавую работу, узгодненую з эканамічнымі камісіямі праформаганаў. Асаблівая ўвага надавалася працы на чыгунцы [8, л. 87–88]. Але масавага ўдзелу камсамольцаў у прафсаюзнай працы не назіралася. Больш таго, лічылася, што і камсамольскія прадстаўнікі ў прафсаюзах былі недастаткова ў яе ўцягнуты [9, л. 22, 36, 65, 97]. Гэта гаворыць аб тым, што, нягледзячы на ўсе захады, камсамольцы яшчэ не праніклісе неабходнасцю прафсаюзнай працы і кампартыя чакала ад КСМБ большага выніку.

Па прафсаюзных пытаннях не радзей раза ў месяц праводзіліся агульныя сходы рабочай моладзі да 18 (часам да 20) гадоў, у залежнасці ад вырашаемых грамадскіх ці эканамічных пытанняў. Павестка сходаў адмыслова рыхтавалася. Кампанія канферэнцый маладых рабочых прайшла ў 1923 г. па ўсёй рэспубліцы. У выніку, згодна справаздач камсамола, была наладжана сувязь з усімі прафсаюзамі і нізавымі прафячэйкамі, куды былі падабраныя прадстаўнікі, якія праводзілі вялікую працу сярод маладых людзей. Юнакі і дзяўчыны з ліку рабочых былі шырока ахоплены камсамольскай працай і лёгка збіраліся, асабліва на прыватных дробных прадпрыемствах, дзе моладзь была разбіта на групы, за якімі былі замацаваныя камсамольцы [8, л. 88–89, 99]. У мястэчках КСМБ вёў асцярожную працу без ужывання прымусу ў дачыненні да моладзі і жорсткіх захадаў у адносінах да прыватных гаспадароў [9, л. 23], што сведчыць пра ўлік спецыфікі НЭП. Аднак лічылася, што маладыя рабочыя дзяржаўных прамысловых прадпрыемстваў былі мала закранутыя дзейнасцю саюза. У некаторых павятовых камсамольскіх прадстаўнікоў у прафсаюзах назіраўся адрыў працы ад агульнасаюзнай [12, л. 56]. Як бачым, прыярытэт камсамол у гэты час аддаваў абароне інтарэсаў моладзі на прыватных прадпрыемствах, што цалкам зразумела. Увогуле, на наш погляд, улічваючы колькасць КСМБ у гэты час, малаверагодна, што ім праз сваіх прадстаўнікоў былі ахоплены ўсе нізавыя прафячэйкі ССРБ.

У 1924 г. камсамол актыўна ўдзельнічаў ва ўсіх прафсаюзных з'ездах БССР [13, л. 90]. Усяго на гэтых форумах дэлегаты з ліку моладзі складалі каля 15 % [14, л. 30]. Актыўна працавалі камсамольскія ячэйкі ў фабзаўмясцкамах і іх камісіях. Шэраг камсамольцаў знаходзіўся на адказнай прафсаюзнай рабоце. Прадстаўнік ЦК ЛКСМБ з'яўляўся членам прэзідыума Цэнтральнага савета прафесійных саюзаў (ЦСПС) БССР [15, л. 28]. Узмацнілася праца прадстаўнікоў акругкамаў камсамола ў акруговых аддзяленнях прафсаюзаў. Яны ў большасці выбіраліся, склікалі нарады прадстаўнікоў

ЛКСМБ у фабзаўкамах, сходы моладзі для абмеркавання прафесійных і камсамольскіх пытанняў. Па ініцыятыве шэрагу прадстаўнікоў ЦК саюза ў Цэнтральных праўленнях (ЦП) прафсаюзаў была склікана ўсебеларуская нарада камсамольскіх прадстаўнікоў у акруговых аддзяленнях прафсаюзаў гарбароў, дрэваапрацоўшчыкаў, харчавікоў. Прафсаюзы савецкіх работнікаў, гарбароў, друкароў і транспартнікаў на ўсесаюзныя з'езды адпраўлялі камсамольцаў [16, л. 10].

Найлепш праца ЛКСМБ у прафсаюзах была арганізавана на чыгуначным транспарце, дзе ў кожным прафсаюзным мясцкаме меліся камсамольскія прадстаўнікі. Усяго нізавой прафсаюзнай работай тут займаліся 173 камсамольцы. Пры чым усе прадстаўнікі камсамола выбіраліся, акрамя участковых прафкамаў. У выніку вялікая колькасць юнакоў і дзяўчын была ўцягнута ў дзейнасць камісій: па ахове працы, культурных, вытворчых, дэлегатаў, зборшчыкаў членскіх складак і г. д. [16, л. 15].

Усё гэта сведчыць аб актыўным характары прафсаюзнай працы камсамольцаў на той час, якая між іншым не была пазбаўлена хібаў: некаторыя прафсаюзы не засвоілі прынцыпаў узаемаадносін з камсамолам, што сведчыць аб наяўнасці як мінімум непаразуменняў паміж гэтымі грамадскімі арганізацыямі; прадстаўнікі ЦК ЛКСМБ у прафсаюзных ЦП былі незаўсёды добра падабраны, а ў некаторых прафсаюзах увогуле адсутнічалі; былі выпадкі, калі абраныя ў прафсаюзныя органы камсамольцы працу вялі слаба [16, л. 11, 15–16].

Ва ўзбуйнёнай БССР на красавік 1924 г. у вытворчых прафсаюзах налічвалася 37 026 дарослых і 3093 (8,3 %) падлеткаў, а ў невытворчых — 58 436 і 1059 (1,8 %), разам — 95 456 і 4162 (4,4 %). Прыкладна столькі ж у прафсаюзах Беларусі налічвалася і моладзі [14, л. 29]. У цэлым гэта адносна невысокія лічбы, што гаворыць аб недастатковай выніковасці працы камсамола па ўцягванню ў прафсаюзны рух маладога пакалення.

Разам з тым колькасць падлеткаў у акружных аддзяленнях прафсаюзаў і фабзаўмясцкамах мела тэндэнцыю да роста. Так, у 1924 г. на 1 кастрычніка ў БССР налічвалася 901 член акружных аддзяленняў прафсаюзаў, з іх 10,1 % падлеткаў і 2623 члены фабзаўмясцкамаў, з іх 7,4 % падлеткаў, а на 31 снежня — 1270 членаў акружных аддзяленняў прафсаюзаў, з іх 12,1 % падлеткаў і 3917 членаў фабзаўмясцкамаў, з іх 11,7 % падлеткаў [17, л. 33].

Увогуле ў 1924 г. назіраўся рост папулярнасці прафсаюзаў сярод падлеткаў. Найбольшая колькасць іх была ў прафсаюзах гарбароў, нархарча і швейнікаў, а ў працэнтных адносінах — у прафсаюзах металістаў, гарбароў і нархарча. Прычым працэнт падлеткаў у прафсаюзе металістаў амаль у сем разоў перавышаў іх сярэдні працэнт па ўсіх прафсаюзах. У 1925 г. найбольшая колькасць падлеткаў была ў прафсаюзах гарбароў, швейнікаў, работнікаў зямлі і леса, а ў працэнтных адносінах — у прафсаюзах швейнікаў, нархарча і гарбароў. Прычым працэнт падлеткаў у прафсаюзе швейнікаў больш чым у шэсць разоў перавышаў іх сярэдні працэнт па ўсіх прафсаюзах [17, л. 32–33]. Усё гэта сведчыць аб значнай працы названых прафсаюзаў сярод маладых працаўнікоў і адпаведнай іх прыцягальнасці для моладзі. Прычым найбольш устойлівай і выніковай напрацягу двух гадоў гэта праца была ў прафсаюзах нархарча і швейнікаў. Прафсаюз гарбароў хоць і захоўваў лідарства па колькасці падлеткаў, але іх лік паступова скарачаўся. Агульная колькасць падлеткаў у прафсаюзах хаця і вырасла, але працэнтная вага за два гады фактычна не змянілася і складала каля 4 %. Найбольш значна вырасла колькасць падлеткаў у прафсаюзах харчавікоў, работнікаў зямлі і леса, швейнікаў, што гаворыць аб актыўнай працы па прыцягненні моладзі ў іх шэрагі.

Аднак неабходна адзначыць, што не ўсе падлеткі — члены прафсаюзаў былі працаўладкаваныя. Сярод беспрацоўных падлеткаў было 350 членаў прафсаюзаў (22 %) [18, л. 129].

На 1 студзеня 1925 г. у фабзаўмясцкамах налічвалася 3917 членаў і кандыдатаў, з іх 463 камсамольцы (11,8 %). Увогуле ж працэнт моладзі ў іх быў значна вышэйшы, бо большую яе частку складалі беспартыйныя ці члены КП(б)Б [19, л. 80], а гэта значыць, што ЛКСМБ ахопліваў сваім уплывам далёка не ўсіх маладых членаў прафсаюзаў.

У лютым 1925 г. моладзь актыўна ўдзельнічала ў перавыбарах фабзаўмясцкамаў і ў выбарах дэлегатаў на прафз'езды [20, л. 13], на якія была абрана значная колькасць маладых дэлегатаў [19, л. 63].

Камсамол таксама працягваў павялічваць актыўнасць у прафсаюзнай працы і на перавыбарах прафсаюзных арганізацый. Да прафз'ездаў асобна праводзіліся нарады камсамольскіх дэлегатаў і рабочай моладзі [21, л. 3, 33].

Усё гэта давала даволі неблагі плён. Калі на 1 кастрычніка 1924 г. у ЦСПСБ налічвалася 4,7 % моладзі, то на 1 кастрычніка 1925 г. — 6,7 %. У акруговых прафбюро — адпаведна 5 і 7,5 %, у раённых — адпаведна 15,2 і 24,2 %. У ЦП прафсаюзаў адпаведна 3,2і 12,1 % моладзі, у акруговых аддзяленнях прафсаюзаў — адпаведна 10,1 % і 18,4 % [19, л. 79]. У фабзаўмясцкамах адпаведна 12,7 і 13,6 %, у камісіях — 15,5 %. У 1925 г. 292 маладыя чалавекі працавалі на пасадах у нізавых прафсаюзных арганізацыях [17, л. 29]. Вылучаны маладзёжны прафактыў вызначаўся прафесійнасцю [22, л. 553].

У выніку перавыбараў фабзаўмясцкамаў у іх новы склад былі уключаны і камсамольцы. Гэта выкарыстоўвалася для ўцягвання маладых рабочых у шэрагі ЛКСМБ. Камсамольцы праводзілі прафдні моладзі. Акругкамы саюза і моладзь увогуле актыўна ўдзельнічалі ў акруговых канферэнцыях прафсаюзаў БССР, што дазволіла правесці ў склад некаторых акруговых прафсаюзных аддзяленняў па некалькі камсамольцаў. Прадстаўнікі ЦК ЛКСМБ меліся ва ўсіх прафсаюзах, а таксама ў ЦСПС рэспублікі [19, л. 39, 49; 21, л. 33].

У 1925 г. амаль па ўсіх пытаннях прафсаюзы мелі з камсамолам поўны кантакт, хаця некаторыя прафсаюзныя работнікі перакладалі ўсю працу сярод моладзі на прадстаўнікоў саюза [17, л. 32–33]. ЛКСМБ актыўна праводзіў міжпрафсаюзныя і ўнутрыпрафсаюзныя нарады моладзі. Такое ўзаемадзеянне таксама давала плён. На 1 кастрычніка 1925 г. у прафсаюзах БССР налічвалася 5247 падлеткаў і 20 064 чалавекі моладзі 18–23 гадоў (17,1 % усіх членаў прафсаюзаў), а разам — 25 311 чалавек (21,6 % усіх членаў прафсаюзаў) [19, л. 78].

Аднак непісьменная і малапісьменная моладзь больш цяжка уцягвалася ў прафсаюзы [20, л. 129], камсамольцы

і маладыя рабочая яшчэ мала ўдзельнічалі ў жыцці прафсаюзаў. Камсамольскія ячэйкі пры прафсаюзах у большасці былі слабыя з-за неаднароднасці складу, малога актыву і партядра [23, л. 71].

Увогуле ў першым паўгоддзі 1925 г. камсамольцы на прафсаюзную працу фактычна не звярталі ўвагі і адносіліся да яе пасіўна, не ведалі мэты дзейнасці прафсаюзаў [17, л. 8; 24, л. 3; 25, л. 1]. Імі несістэматычна і недастаткова праводзіліся прафдні сярод рабочай моладзі [26, л. 3]. На прафднях мала ўлічваліся запыты і інтарэсы юнакоў і дзяўчын. Беспартыйныя маладыя людзі часта не ішлі на прафдні, а ў некаторых месцах — і камсамольцы [20, л. 78]. На агульных дэлегацкіх сходах і ў кіруючых прафорганах нярэдка не ўзнімаліся моладзевыя і нават камсамольскія пытанні. Прадстаўнікі ЛКСМБ у прафсаюзах часта змяняліся [27, л. 31–32]. Былі выпадкі, калі ячэйкі саюза падмянялі сабой прафорганы, але пры гэтым слаба асвятлялі перад рабочымі пытанні моладзі; маладыя члены прафсаюзаў не наведвалі сходаў, не плацілі членскіх складак [17, л. 34; 19, л. 66; 20, л. 127].

Як вынік прафсаюзы мала надавалі ўвагі працы сярод моладзі [28, л. 18] і мала адстойвалі перад дзяржорганамі пытанні паляпшэння яе эканамічнага становішча. У пачатку 1925 г. кіраўнікі прафсаюзаў нархарча, будаўнікоў і часткова папернікаў нават выказваліся за ліквідацыю камсамольскага прадстаўніцтва [22, л. 552].

Сітуацыя змянілася ў другой палове 1925 г., калі акругкамы ЛКСМБ актыўна прымалі ўдзел і ў акруговых міжсаюзных з'ездах прафсаюзаў БССР. На гэтыя з'езды ЦСПС рэспублікі выставіў для разгляду пытанні броні, вучаніцтва, кваліфікацыі маладых працаўнікоў, уключэнне працы сярод моладзі ў агульную працу прафсаюзаў, больш шырокага ахопу рабочых юнакоў і дзяўчын прафсаюзамі ў прыватнай і дробнай прамысловасці. У з'ездах удзельнічалі прадстаўнікі моладзі, выбраныя на акруговых прафсаюзных канферэнцыях. У выніку прафсаюзы ажывілі працу сярод маладога пакалення, асабліва ў нізавых ячэйках, і дасягнулі некаторых поспехаў у павелічэнні зарплаты юнакоў і дзяўчын [21, л. 34].

Камсамольскія прадстаўнікі ў ЦП прафсаюзаў склікаліся ЦК ЛКСМБ на нарады адзін раз у тры тыдні. Адбылася ўсебеларуская эканамічная нарада акругкамаў саюза з прадстаўнікамі ЦК камсамола БССР у ЦП прафсаюзаў. Сумесна з ЦП дрэваапрацоўшчыкаў і харчавікоў былі праведзены ўсебеларускія нарады прадстаўнікоў моладзі ў акруговых аддзяленнях гэтых прафсаюзаў, дзе разглядаліся тарыфна-эканамічныя і культурна-масавыя пытанні. Такія нарады прайшлі таксама амаль па ўсіх акругах. На асобныя з'езды беларускіх прафсаюзаў былі дэлегаваны прадстаўнікі з ліку юнакоў і дзяўчын у ЦП друкароў, гарбароў, транспартнікаў, савецкіх работнікаў. Да гэтага часу прайшлі шырокія канферэнцыі маладых рабочых па ўсёй БССР, прымеркаваныя да юбілею прафсаюзаў. На V Усебеларускі прафсаюзны з'езд, які адбыўся напрыканцы 1925 г., былі абраны 11 камсамольцаў і 25 маладых членаў прафсаюзаў (разам 9 % ад усіх дэлегатаў). Па ініцыятыве ЛКСМБ на ім было абмеркавана пытанне працы сярод моладзі [29, с. 137]. Пастановы з'ездаў прафсаюзаў прапагандаваліся сярод рабочых юнакоў і дзяўчын на нарадах эканамічнага актыва [21, л. 34].

У выніку супрацоўніцтва камсамола з прафсаюзамі паспяхова вырашаліся пытанні працаўладкавання маладых людзей, іх вытворчага навучання, умацавання працоўнай дысцыпліны, росту вытворчасці працы і заробкаў моладзі, паляпшэння ўмоў яе быту. Значная колькасць юнакоў і дзяўчын была ўключана ў кіруючую працу прафсаюзаў. Але ў ЛКСМБ было ўцягнута менш 50 % прафсаюзнай моладзі, асабліва ў сельскай мясцовасці [20, л. 85], што сведчыць аб большай прыцягальнасці прафсаюзаў для юнакоў і дзяўчын у параўнанні з камсамолам, а таксама зацікаўленасці маладога пакалення ў адстойванні ў першую чаргу сваіх эканамічных інтарэсаў.

Разам з тым з'езды прафсаюзаў і нарады моладзі паказалі, што праца ЛКСМБ у прафсаюзах не спрыяе падрыхтоўцы будучых прафработнікаў (з-за цякучкі і перагружанасці камсамольскіх прадстаўнікоў). Таму праца прафсаюзаў сярод маладога пакалення кульгала [20, л. 174]. Да таго ж лічылася няправільным, калі прадстаўнікі юнакоў і дзяўчын абіраліся ў прафсаюзныя органы сходамі моладзі. У 1925 г. гэта было выкаранена і выбары ажыццяўляліся на агульных прафсаюзных сходах [19, л. 61], што, зразумела, з аднаго боку, змяншала верагоднасць абрання маладых асоб на адказныя пасады, але з другога — спрыяла вылучэнню з іх ліку больш здольных да такой працы.

Расла колькасць падлеткаў у прафсаюзах БССР: на 1 кастрычніка 1925 г. — 4701 (3309 юнакоў і 1392 дзяўчыны), на 1 кастрычніка 1926 г. — 5408 (3882 юнакі і 1526 дзяўчын), на канец 1926 г. — 5595, на канец 1927 г. — 6581 [18, л. 27, 129; 22, л. 625]. Як бачым, тэндэнцыя роста колькасці падлеткаў у прафсаюзах БССР была устойлівай і сярод іх мелася даволі высокая колькасць дзяўчын (каля 40 %).

Рос і агульны лік рабочай моладзі ў прафсаюзах: 1 кастрычніка 1926 г. — 28 568 чалавек; 1 красавіка 1927 г. — 42 647 чалавек (19,5 % ад усіх членаў) [18, л. 139].

Камсамол працягваў шчыльней звязвацца з прафсаюзамі [27, л. 18]. Лік камсамольцаў, вызваленных ад працы на вытворчасці дзеля працы па прафлініі, у БССР на 1 студзеня 1926 г. складаў у вытворчых прафсаюзах 15 (12 %), невытворчых — 5 (11,9 %) [30, л. 19]. У гарадскіх прамысловых прадпрыемствах камсамольцы ўдзельнічалі ў фабзаўкамах і іх камісіях [НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 54. л. 27]. Камсамольцаў — упаўнаважаных фабзаўмясцкамаў па БССР налічвалася ў вытворчых прафсаюзах 53 (12,1 %), невытворчых — 23 (6,6 %) [30, л. 20].

ЛКСМБ пераважна актыўна ўдзельнічаў у перавыбарах фабзаўмясцкамаў. У іх была абрана даволі шмат беспартыйнай моладзі і камсамольцаў, значная колькасць якіх пераабралася. У фабзаўмясцкамах вытворчых прафсаюзаў налічвалася 508 (16 %), а ў невытворчых — 122 (8 %) камсамольцаў [30, л. 18; 31, л. 14]. У розных камісіях пры фабзаўкамах камсамольцы складалі 17,5 % [32, л. 14]: расцэначна-канфліктныя — 1469 членаў, з іх 86 членаў і кандыдатаў ЛКСМБ (5,9 %); аховы працы — 3124 і 285 (9,1 %); вытворчыя — 2756 і 91 (3,3 %); культасветныя — 3833 і 483 (12,6 %); рэвізійныя — 3464 і 278 (8 %) [30, л. 6]. Як бачым, працэнт камсамольцаў

у фабзаўмясцкамах вырас, большасць прадстаўнікоў камсамола была сканцэнтравана ў вытворчых прафсаюзах. Найбольш камсамольцаў налічвалася ў культасветных, аховы працы і рэвізійных камісіях фабзаўмясцкамаў, што сведчыць аб асноўных напрамках дзейнасці ЛКСМБ у прафсаюзах.

Аднак меліся і значныя хібы камсамольскай прафсаюзнай працы. Так, агульны працэнт камсамольцаў у фабзаўмясцкамах часткова знізіўся ў гарбароў, друкароў, сувязістаў, працаўнікоў асветы, што гаворыць аб пэўных недапрацоўках камсамола ў гэтых прафсаюзах. Меліся факты парушэння фракцыйнай дысцыпліны і правалу камсамольскіх кандыдатур. Недастатковы быў працэнт камсамолак у складзе ўпаўнаважаных. Больш нізкі працэнт камсамольцаў быў у невытворчых саюзах (асабліва на чыгунцы). Камсамольцы слаба ўдзельнічалі ў агульнапрафсаюзнай працы на месцах і ў ЦП прафсаюзаў. Недастатковай была дзейнасць па ахове працы моладзі ў саматужнай прамысловасці, сярод парабкаў, у прафсаюзе работнікаў мастацтва. Адзначалася прафесійнае непісьменства моладзевага актыву прафсаюзаў. Выхаваўчая праца ЛКСМБ была слаба звязана з працай прафсаюзаў [27, л. 33; 33, л. 54, 117; 34, л. 10].

Разам з тым актыўнасць і зацікаўленасць рабочай моладзі ў прафсаюзнай працы значна ўзрасла [18, л. 28; 33, л. 127, л. 153; 34, л. 10; 35, л. 9].

У 1926 г. прафсаюзамі быў зроблены значны крок у паляпшэнні становішча падлеткаў на вытворчасці. Рашэннем 5-га ўсебеларускага з'езда прафсаюзаў, каб зацікавіць у навучанні падлеткаў на вытворчасці, для майстроў устанаўлівалася кампенсацыя: для кіраўнікоў брыгаднага навучання — поўная аплата за кошт гаспадарчых органаў; пры індывідуальным навучанні майстрамі-здзельшчыкамі кампенсацыя ажыццяўлялася зніжэннем норм выпрацоўкі і падвышэннем разраду. Рашэнне было ўзгоднена з Вышэйшым саветам народнай гаспадаркі (ВСНГ) БССР і Галоўкамунгасам [35, л. 11–12].

У 1927 г. у складзе ЦП прафсаюзаў (399 чалавек) было 6,3 % маладых людзей ва ўзросце да 23 гадоў, у акруговых аддзяленнях — 10,5 %, раённых прафбюро — 14,2 %, акруговых прафбюро — 14,5 %. Моладзь больш актыўна ўдзельнічала ў працы прафсаюзаў. На пасадах у нізавых прафячэйках налічвалася 5188 юнакоў і дзяўчын ва ўзросце да 23 гадоў (15,6 %). Актыў з моладзі ў фабзаўмясцкамах і іх камісіях складаў 9148 чалавек (18,1 %), сярод 3503 іх платных працаўнікоў — 14,7 %, сярод прафупаўнаважанных — 19,4 %. У камісіях маладыя людзі складалі: у расцэначна-канфліктных — 8,4 %, па ахове працы — 17,1 %, па культуры — 22 %, вытворычых — 6,3 %, рэвізійных — 10,5 %. Супрацоўніцтва ЛКСМБ і прафсаюзаў некалькі палепшылася. Вылучаны малады прафсаюзны актыў праяўляў інтарэс да жыцця прадпрыемстваў [36, л. 203]. Як бачым, у параўнанні з 1925 г. адбыўся значны, хоць і нераўнамерны, рост колькасці маладых людзей у праворганах. Іх прадстаўніцтва знізілася ў ЦП прафсаюзаў (на 1,2 %) і ў раённых прафбюро (на 10 %). Разам з тым колькасць юнакоў і дзяўчын узрасла ў акруговых прафбюро на 7 %, у фабзаўмясцкамах і іх камісіях — на 3,5 % (пры гэтым больш высокі працэнт маладых людзей быў у камісіях па культуры, ахове працы і рэвізійных), а найбольш рэзка, амаль у 18 разоў — на пасадах у нізавых прафячэйках. Гэта сведчыць аб асабліва актыўным вылучэнні моладзі на пасады ў нізавых прафсаюзных структурах.

Аднак у прафсаюзах яшчэ слаба была пастаўлена масавая праца сярод маладых рабочых. Моладзевыя пытанні не ставіліся на дэлегацкіх і агульных прафсаюзных сходах. Прафапарат слаба сачыў за выкананнем дырэктыў наконт моладзі. Прафсаюзы былі мала зацікаўлены ў кваліфікацыі рабочых з ліку юнакоў і дзяўчын на вытворчасці. У прафсаюзных ЦП яшчэ не былі створаны належныя ўмовы для нармальнай працы прадстаўнікоў камсамола [37, л. 108]. Моладзь была слаба азнаёмлена з тэорыяй і практыкай прафруху. Дзейнасць камсамольцаў у прафсаюзах часта была ёй малавядомая [36, л. 203]. Не толькі беспартыйныя юнакі і дзяўчыны, але і камсамольцы адносіліся да сваіх прафсаюзных абавязкаў халатна. Прадстаўнікі ад моладзі ў праворганах нярэдка нічога не рабілі. Кантроль над іх працай адсутнічаў і яны не бывалі на прадпрыемствах [28, л. 16]. У выніку некаторыя кіраўнікі прафсаюзаў імкнуліся ліквідаваць прадстаўніцтвы ЛКСМБ і па-іншаму працаваць з моладдзю [18, л. 29]. Такім чынам, нягледзячы на колькасны рост маладога прафсаюзнага актыву, яго праца пакідала жадаць лепшага, а самі прафсаюзы далёка незаўсёды былі зацікаўлены ў вырашэнні актуальных для юнакоў і дзяўчын пытанняў.

У 1928 г., па няпоўных дадзеных, у прафсаюзах БССР моладзі да 23 гадоў налічвалася каля 50 000 чалавек [38, л. 130], што гаворыць аб росце яе колькасці. Аднак асобныя прафарганізацыі недастаткова ўвагі надавалі пытанням працы (у тым ліку выкананню нормаў броні для падлеткаў) і адукацыі маладых рабочых [38, л. 153; 39, л. 31]. У большасці прафсаюзаў ім не гарантавалася вячэрняя тэхнічная адукацыя [18, л. 133].

Хаця прафсаюзы і ўзмацнілі ўвагу да вылучэння юнакоў і дзяўчын на працу ў праворганах, але кіраўніцтва і кантроль за гэтай моладдзю з боку камсамольскіх ячэек аслабеў, адзначалася невысокая якасць, адсутнасць планавасці, назіралася перагружанасць асобных работнікаў. Зменшылася колькасць маладых рабочых у складзе выбарных прафсаюзных органаў, хаця некалькі ўзмацніўся ўдзел моладзі ў кампаніі заключэння калектыўных дамоў. Увогуле праца прафсаюзаў і ЛКСМБ па вылучэнні і падрыхтоўцы маладога прафактыву была нездавальняючай, як і праца прафсаюзных арганізацый сярод батрацкай і саўгаснай моладзі [40, л. 52; 41, л. 13, 82, 90; 42, л. 366, 371]. Адзначалася кепская сувязь прадстаўнікоў ЦК ЛКСМБ у ЦП прафсаюзаў з мясцовымі прадстаўнікамі АК камсамола ў акруговых прафбюро (прадстаўнікі ў прафсаюзах нархарчу і хімікаў зусім не мелі сувязі з месцамі), аслабленне ўзаемасувязі ЛКСМБ з прафсаюзнымі арганізацыямі на перыферыі [43, л. 3]. Камсамольскія прадстаўнікі ў прафсаюзных арганізацыях недастаткова ўдзельнічалі ў іх працы і часта змяняліся [41, л. 15]. Значна зменьшылася колькасць камсамольцаў у нізавым апараце прафсаюзаў чыгуначнікаў (1), скурнікаў (2), нархарчу (2), працаўнікоў асветы (1); у сярэднім апараце прафсаюзаў чыгуначнікаў (6), скурнікаў (1), работнікаў зямлі і лесу (3), дрэваапрацоўшчыкаў (1),

хімікаў (1), харчавікоў (2), будаўнікоў (3), папернікаў (1), металістаў (1), працаўнікоў асветы (1), медсанпрацы (1), савецкіх служачых (2); у акруговых прафбюро і ЦСПС (5). Усяго ў нізавых звеннях прафсаюзаў налічвалася 60 камсамольцаў, а ў сярэдніх – 28 [44, л. 47]. Асобныя прафсаюзы ўвогуле імкнуліся ліквідаваць інстытут прадстаўнікоў камсамола ў прафсаюзных арганізацыях [41, л. 81]. Як бачым, разам са змяншэннем колькасці моладзі ў прафорганах адбылося рэзкае скарачэнне прадстаўніцтва членаў ЛКСМБ у прафсаюзах і зніжэнне якасці іх дзейнасці, што сведчыць, з аднаго боку, аб адсутнасці ў камсамольскага кіраўніцтва ўвагі да прафсаюзнай працы, а з другога – як мінімум аб непаразуменнях ва ўзаемаадносінах паміж камсамолам і прафсаюзамі.

У 1929 г. усебеларуская нарада эканампрацаўнікоў з ліку моладзі паказала значна ўзрослы тэарэтычны і практычны ўзровень маладога актыву ў прафарганізацыях [45, л. 8]. Узмацніўся ўдзел юнакоў і дзяўчын у прафрабоце, яны вылучалася на адказныя кіруючыя пасады. Аднак назіраліся пэўныя пасіўныя адносіны вылучэнцаў з моладзі да прафработы [46, л. 5]. Арганізацыі ЛКСМБ, па-ранейшаму, прымалі недастатковы ўдзел у перабудове працы прафсаюзаў адпаведна тэмпам будаўніцтва народнай гаспадаркі. Зусім малая камсамольская праслойка была ў прафсаюзным апараце (у нізавых звеннях – 2,4 %, у сярэдніх – 1,4 %). І гэта пры ўсё больш узрастаючай актыўнасці рабочай моладзі ў сацыялістычным будаўніцтве і працы прафсаюзаў [44, л. 46; 47, л. 232], што сведчыць аб працягу заняпада прафсаюзнай дзейнасці камсамола.

Меліся адзінкавыя выпадкі падмены ячэйкамі ЛКСМБ органаў прафсаюза работнікаў зямлі і леса, у якім пытанні працы сярод батрацкай і саўгаснай моладзі абмяркоўваліся толькі ў вузкіх колах прадстаўнікоў моладзі ў прафсаюзных органах, яго праўленнях і камсамольскіх камітэтах. Нягледзячы на гэта, колькасць ахопу батрацкай моладзі прафсаюзамі паступова расла: на 1 студзеня 1928 г. – 8460 маладых батракоў, на 1 кастрычніка 1929 г. – 14 603, а на 1 студзеня 1930 г. – 21 218 [42, л. 366; 46, л. 6–7; 48, л. 79].

У 1930 г. удзел камсамола Беларусі ў прафсаюзнай рабоце не палепшыўся [49, л. 3]. Прафсаюзы БССР слаба займаліся пытаннямі абароны інтарэсаў камсамольцаў і моладзі [50, л. 324]. Так, 10 кастрычніка 1930 г. была сарвана супольная нарада бюро ЦК ЛКСМБ з ЦСПС Беларусі і старшынямі ЦП прафсаюзаў, бо апошнія не з'явіліся [51, л. 289]. ЦСПС БССР зняў подпіс ЦК камсамола Беларусі са сваёй агульнай з РСІ і ВСНГ адозвы да брыгад па праверцы становішча сацыялістычнага спаборніцтва, бо ЦК ЛКСМБ даў у брыгады малую колькасць працаўнікоў [52, л. 71].

Пастановай сакратарыята ЦК ЛКСМБ ад 22 жніўня 1930 г. пачалося масавае вылучэнне рабочай моладзі на кіруючыя пасады ў прафсаюзах. Гэта праводзілася па рашэнні ЦК УЛКСМ з нагоды 16-га Міжнароднага юнацкага дня. З ліку ўдарнікаў і лепшых прадстаўнікоў брыгад «лёгкай кавалерыі» на цэнтральную прафсаюзную працу былі вылучаны толькі 10, а на нізавую – толькі 15 камсамольцаў [52, л. 164], што зусім мала.

У маі 1931 г. абсалютна нездавальняючым быў удзел камсамола ў месячніку самаправеркі перабудовы работы прафсаюзаў БССР [53, л. 129]. У верасні 1931 г. была сарвана мабілізацыя камсамольцаў на прафсаюзную працу [54, л. 41–42]. Аднак ЛКСМБ аказаў вялізную дапамогу прафсаюзам у разгортванні сацыяльна-тэхнічных экзаменаў як вышэйшай формы сацыялістычнага спаборніцтва ў барацьбе за авалоданне тэхнікай [55, л. 145].

Абследаванні праведзеныя інспекцыяй працы ЦСПС Беларусі і ЦП прафсаюзаў у 1934 г. засведчылі парушэнні заканадаўства аб працы падлеткаў на шэрагу прадпрыемстваў БССР (без усялякіх дазволаў на працу прымаліся падлеткі малодшыя за 16 гадоў, не прадастаўляўся падоўжаны чарговы адпачынак, адсутнічаў скарочаны рабочы дзень, падлеткі працавалі на начных зменах, звыштэрміновых работах, шкодных працэсах і ў галінах, дзе іх праца ўвогуле была забаронена) [56, л. 78].

У 1936 г. прадстаўнікі ЦК ЛКСМБ у прафсаюзах у большасці не клапаціліся аб інтарэсах моладзі. Надзвычай слабая дапамога аказвалася вясковым раёнам [57, с. 1].

Такое нездавальняючае становішча прафсаюзнай працы і супрацоўніцтва з камсамолам можна растлумачыць барацьбой з апазіцыяй унутры кампартыі. З-за чаго напрыканцы 1920-х гг. у дачыненні да самай масавай грамадскай арганізацыі ўжылі так званыя арганізацыйныя меры: былі зменены 72 % кіруючых прафсаюзных кадраў, адбыліся разбуйненне і рэформа структур прафсаюзаў. У 1930-я гг. большасць прафсаюзных кадраў БССР былі ўвогуле рэпрэсіраваны. У выніку толькі напрыканцы 1930-х гг. грамадская актыўнасць прафсаюзаў пачала зноў расці [58, с. 570–571].

Асобна неабходна ўзгадаць Беларускае бюро пралетарскага студэнцтва (з 1926 г. – Цэнтральнае бюро пралетарскага студэнцтва). Яно дзейнічала з верасня 1923 г. да ліпеня 1932 г. у Мінску і з'яўлялася кіруючым органам для беларускіх студэнтаў – членаў прафсаюзаў. Прафсаюзамі ў Савецкай Беларусі ахопліваліся ад 25 да 60 % студэнтаў (напрыклад, у 1926 г. з 9707–5570). Пры чым пры прыёме ў прафсаюзы ўлічвалася сацыяльнае паходжанне і здаваўся экзамен на палітычную пісьменнасць (звычайна прымаліся студэнты старэйшых курсаў і актывісты грамадскай працы). Бюро абіралася на канферэнцыі студэнцкіх прафсаюзных арганізацый і складалася з 15 членаў і пяці кандыдатаў, кіравалася прэзідыўмам з пяці членаў і двух кандыдатаў; падзялялася на арганізацыйную, акадэмічную, культурна-асветную і эканамічную камісіі; аб'ядноўвала Віцебскае, Гомельскае і Магілёўскае гарадскія бюро, прафкамы і выканаўчыя бюро прафсекцый ВНУ, тэхнікамаў, рабфакаў і саўпартшкол у Беларусі, а таксама беларускія студэнцкія зямляцтвы ў ВНУ СССР; падпарадкоўвалася ЦСПСБ, галіновым прафсаюзам і Маскоўскаму Цэнтральнаму бюро пралетарскага студэнцтва пры ВЦСПС. У 1926–1930 гг. адбыліся шэсць канферэнцый, на якіх заслухоўваліся справаздачы бюро і Народнага камісарыята асветы БССР, разглядаліся агульнапалітычныя пытанні, з дакладамі выступалі кіраўнікі Савецкай Беларусі. Студэнцкія прафсаюзныя арганізацыі будаваліся паводле вытворчага прынцыпу (за выключэннем рабфакаў). Бюро мела сваіх прадстаўнікоў у калегіі Галоўпрафасветы і навукова-

метадалагічным камітэце Народнага камісарыята асветы БССР, міжведамаснай камісіі па размеркаванні на працу і практыку, біржы працы, праўленнях і дэканатах ВНУ. У 1925 г. бюро выпускала часопіс «Чырвоны сьцяг», а ў 1929–1930 гг. — радыёгазету «Чырвоны студэнт». Студэнцкія прафкамы сярод іншага ўдзельнічалі ў абмеркаванні вучэбных планаў, распрацоўцы метадычных матэрыялаў, уплывалі на фарміраванне прыёмных камісій і камплектаванне вышэйшай і сярэдняй школы, размеркаванне студэнтаў на працу і практыку, а таксама удзельнічалі ва ўсіх кампаніях, якія праводзіла кампартыя. З 1928 г. бюро актыўна ўдзельнічала ў барацьбе з праявамі ў навучальных установах чужой ідэалогіі, у іх пралетарызацыі і ачышчэнні ад сацыяльна чужых элементаў. Паводле пастановы ВЦСПС ад 1 ліпеня 1932 г. функцыі Цэнтральнага бюро пралетарскага студэнцтва былі перададзены Арганізацыйнаму бюро студэнцкіх секцый ЦСПСБ, якое дзейнічала да 1 чэрвеня 1937 г. [59].

Як бачым, у прафсаюзным руху надавалася асаблівая ўвага працы са студэнцтвам, што яскрава праявілася ў стварэнні для гэтай мэты асобных прафсаюзных структур. Аднак ахоп прафсаюзамі студэнтаў не перавышаў 60 % з-за практыкі прыёму ў прафсаюзы найбольш падрыхтаваных да грамадскай працы асобаў. Гэта гаворыць аб прыярытэце якаснага, а не колькаснага падыходу ў пашырэнні ўплыву прафсаюзаў на студэнцтва. Студэнцкія прафсаюзныя структуры пры гэтым актыўна выкарыстоўваліся для ажыццяўлення палітыкі кампартыі ў грамадскім асяроддзі. Ліквідацыя ж напрыканцы 1930-х гг. асобнага кіруючага органа для студэнтаў — членаў прафсаюзаў, на наш погляд, хутчэй за ўсё з'яўляецца вынікам палітычнай барацьбы ўнутры кампартыі і сведчыць аб тым, што ён не апраўдаў спадзяванняў партыйнага кіраўніцтва ў гэтай справе.

Такім чынам, у 1920-я гг. адным з важнейшых напрамкаў дзейнасці камсамола лічылася прадстаўніцтва ў прафсаюзах. Ён разглядаў іх як пляцоўку для пашырэння уплыву на моладзь і імкнуўся максімальна выкарыстоўваць сілы і сродкі прафсаюзных органаў у гэтым накірунку.

Увогуле праца камсамола з маладымі членамі прафсаюзаў, з аднаго боку, мела даволі шырокі спектр напрамкаў, што сведчыць аб імкненні да максімальнага ўліку інтарэсаў юнакоў і дзяўчын, а з другога карысталася падтрымкай, у тым ліку матэрыяльнай, прафсаюзнага кіраўніцтва. Такія прыязныя адносіны можна растлумачыць падтрымкай дзейнасці камсамола на дзяржаўным узроўні.

Нягледзячы на гэта, прафсаюзная праца камсамольцаў не была пазбаўлена хібаў: некаторыя прафсаюзы не засвоілі прынцыпаў узаемаадносін з камсамолам, што сведчыць аб наяўнасці як мінімум непаразуменняў паміж гэтымі грамадскімі арганізацыямі; да сярэдзіны 1925 г. камсамольцы, абраныя ў прафсаюзныя органы, працу вялі слаба; адносна невысокая колькасць падлеткаў і моладзі ў прафсаюзах БССР у першай палове 1920-х гг. гаворыць аб недастатковай выніковасці працы камсамола па ўцягванні ў прафсаюзны рух маладога пакалення.

У выніку прафсаюзы мала надавалі ўвагі працы сярод моладзі (за выключэннем студэнцтва). А кіраўнікі некаторых прафсаюзаў нават выказваліся за ліквідацыю камсамольскага прадстаўніцтва.

Аднак сярод маладых людзей існавала зацікаўленасць у працы прафсаюзаў. Нягледзячы на тое, што асобныя прафсаюзы не ўлічвалі інтарэсаў юнакоў і дзяўчын, маладыя працаўнікі прафсаюзных органаў былі празмерна загружаныя, у 1920-я гг. паступова расла колькасць моладзі і падлеткаў сярод членаў і актывістаў прафсаюзаў Беларусі, што сведчыць аб іх імкненні адстойваць свае эканамічныя інтарэсы.

У другой палове 1925 г. ЛКСМБ значна актывізаваў працу ў прафсаюзах. Пад уплывам камсамола ЦСПС Беларусі звярнуў увагу прафсаюзаў на пытанні броні, вучаніцтва, кваліфікацыі маладых працаўнікоў, неабходнасць уключэння працы сярод моладзі ў агульную прафсаюзную працу і больш шырокага ахопу рабочых юнакоў і дзяўчын прафсаюзамі.

У прафсаюзных з'ездах сталі ўдзельнічаць у якасці выбраных дэлегатаў прадстаўнікі маладога пакалення. Прафсаюзы ажывілі працу сярод юнакоў і дзяўчын асабліва ў нізавых ячэйках, што павышала іх прыцягальнасць для моладзі. Найбольш устойлівай і выніковай гэта праца была ў прафсаюзах нархарча і швейнікаў.

Дзякуючы супрацоўніцтву камсамола з прафсаюзамі паспяхова вырашаліся пытанні працаўладкавання маладых людзей, іх вытворчага навучання, умацавання працоўнай дысцыпліны, росту вытворчасці працы і заробкаў юнакоў і дзяўчын, паляпшэння ўмоў іх быту.

У выніку актыўнасць і зацікаўленасць рабочай моладзі ў прафсаюзнай працы ўзрасла. Адбываўся значны, хоць і нераўнамерны, рост колькасці маладых людзей у праф-органах. Асабліва актыўна моладзь вылучалася на пасады ў нізавых прафсаюзных структурах.

Разам з тым вырас і працэнт камсамольцаў у праф-органах, большасць прадстаўнікоў камсамола была сканцэнтравана ў вытворчых прафсаюзах. Найбольш камсамольцаў налічвалася ў культасветных, аховы працы і рэвізійных камісіях фабзаўмясцкамаў, што сведчыць аб асноўных напрамках дзейнасці ЛКСМБ у прафсаюзах.

Але камсамольцамі з'яўляліся менш паловы маладых членаў прафсаюзаў, што гаворыць аб большай прыцягальнасці прафсаюзаў для юнакоў і дзяўчын у параўнанні з камсамолам, а таксама яшчэ раз падкрэслівае іх зацікаўленасць у адстойванні ў першую чаргу сваіх эканамічных інтарэсаў.

Меліся і значныя хібы камсамольскай прафсаюзнай працы. З'езды прафсаюзаў і нарады моладзі паказалі, што праца ЛКСМБ у прафсаюзах не спрыяла падрыхтоўцы будучых прафработнікаў з-за цякучкі і перагружанасці камсамольскіх прадстаўнікоў.

У саміх прафсаюзах яшчэ слаба была пастаўлена масавая праца сярод маладых рабочых. Моладзевыя пытанні не абмяркоўваліся на дэлегацкіх і агульных прафсаюзных сходах. Прафапарат слаба сачыў за выкананнем дырэктыў наконт моладзі. Не былі створаны належныя ўмовы для нармальнай працы прадстаўнікоў камсамола. Моладзь дрэнна валодала тэорыяй і практыкай прафруху. Даволі часта не толькі беспартыйныя юнакі і дзяўчыны, але і камсамольцы адносілася да сваіх прафсаюзных абавязкаў халатна. У выніку некаторыя кіраўнікі

прафсаюзаў імкнуліся ліквідаваць прадстаўніцтвы ЛКСМБ і па-іншаму працаваць з моладдзю.

Дасягнуць канчатковага станоўчага пералому ў працы прафсаюзаў з маладымі людзьмі ў гэты час так і не ўдалося. У 1928 г. адбылося змяншэнне колькасці моладзі ў прафорганах, а таксама рэзкае скарачэнне ў іх прадстаўніцтва камсамольцаў, што сведчыць, з аднаго боку, аб адсутнасці ў камсамольскага кіраўніцтва ўвагі да прафсаюзнай працы, а з другога — як мінімум аб непаразуменнях ва ўзаемаадносінах паміж камсамолам і прафсаюзамі.

Напрыканцы 1920-х — другой палове 1930-х гг., нягледзячы на ўсё больш узрастаючую актыўнасць моладзі ў сацыялістычным будаўніцтве і ў прафсаюзнай працы, ЛКСМБ прымаў недастатковы ўдзел у перабудове працы прафсаюзаў адпаведна тэмпам будаўніцтва народнай гаспадаркі. Зусім невялікай заставалася камсамольская праслойка ў прафсаюзным апараце, а яе праца па адстойванні інтарэсаў моладзі пакідала жадаць лепшага. У сваю чаргу прафсаюзы БССР слаба займаліся пытаннямі абароны інтарэсаў камсамольцаў і моладзі.

Такое становішча можна растлумачыць, тым, што на прафсаюзным жыцці адбілася барацьба з апазіцыяй ўнутры кампартыі. У выніку чаго толькі напрыканцы 1930-х гг. грамадская актыўнасць прафсаюзаў пачала зноў расці.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі. Ф. М-1. Воп. 23. Спр. 32.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 13.
3. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 14.
4. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 12.
5. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 18.
6. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 14.
7. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 29.
8. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 19.
9. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 22.
10. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 45.
11. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 23.
12. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 24.
13. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 33.
14. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 56.
15. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 49.
16. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 41.
17. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 44.
18. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 355.
19. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 54.
20. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 49.
21. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 37.
22. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 64а.
23. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 45.
24. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 42.
25. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 123.
26. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 46.
27. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 59.
28. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 133.
29. Очерки истории Ленинского комсомола Белоруссии. — Мінск : Беларусь, 1975. — 536 с.
30. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 200.
31. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 178.
32. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 211.
33. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 62.
34. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 66.
35. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 245.
36. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 174.
37. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 544.
38. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 452.
39. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 83.
40. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 450.
41. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 448.
42. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 493.
43. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 447.
44. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 454.
45. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 96.
46. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 504.
47. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 93.
48. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 677.
49. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 99.
50. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 114.
51. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 101.
52. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 105.
53. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 130.
54. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 128.
55. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 608.
56. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 611.
57. Учора на з’ездзе. Ранішняе пасяджэнне 14 сакавіка // Чырвоная Зьмена. — 1936. — 15 сакав. — С. 1.
58. Беланоўскі, М. Прафесійныя саюзы / М. Беланоўскі, В. Космач, І. Мандрык // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Мінск : БелЭн, 1999. Т. 5. С. 569–572.
59. Гесь, А. Цэнтральнае бюро пралетарскага студэнцтва / А. Гесь // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Мінск : БелЭн, 2003. Т. 6. Кн. 2. С. 117.


04.02.2015